# СКИБИНА ЕЛИЗАВЕТА АНТОНОВНА



Родилась 20 марта 1926 году в Белорусской ССР, Минской области, Минского р-на, д. Шепели.

Была призвана в 1941 году в Заславском р-не, хутор Здаренне.

Участвовала в боевых действия в составе партизанской бригады «Штурмовая».

Службу завершила 6 мая 2016 года.

После войны проживала в деревне Юзуфово.

Имеет множество наград, из которых: орден «Отечественной войны» II степени, медаль «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.», медаль «За взятие Берлина» и др.

*Из воспоминаний Елизаветы Антоновны:*

«У сям'і бацькоў Елізаветы Антонаўны было пяцёра дзяцей — чатыры сыны і адна дачка. Да вайны і ў часы Вялікай Айчыннай вайны сям'я жыла на хутары Здарэнне, што знаходзіўся недалёка ад вёскі Жукаўка. З 1941-га года Елізавета Антонаўна была сувязной у брыгадзе "Штурмавая". Яна пешшу хадзіла у Мінск, каб сабраць звесткі пра нямецкія атрады, разносіла лістоўкі, выконвала даручэнні партызан. Пасля вайны працавала ў Мінску. Яна адзіная з нямногіх, хто стала сведкай карнай аперацыі пад кодавай назвай "Котбус". Рыхтуючыся да наступления на Арлоўска-Курскай дузе, кіраўніцтва Германіі пачало настойліва патрабаваць ад акупацыйных улад, ахоўных фарміраванняў і ад франтавых часцей вермахта любымі сродкамі ліквідаваць партызан і навесці "парадак" на акупаванай тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым у сакавіку — красавіку 1943 года пачалася падрыхтоўка да карнай аперацыі пад кодавай назвай "Котбус" — супраць народных мсціўцаў і мірнага насельніцтва паўночных раёнаў Міншчыны і сумежных з імі раёнаў Віцебскай і Віленскай абласцей. 04.04.1943 года у 5 гадзін раніцы карнікі, мінуўшы вёскі Рэукуцьевічы і Шаршуны, уварваліся ў вёску Бахметаўка, у якой застаўся начаваць з невялікай групай сакратар Баранавіцкага абкома КПБ В.Я.Чарнышоў. Яны былі захоплены знянацку і адказаць на супраціўленне не змаглі, група адступіла у лес. Немцы, уварваўшыся у вёску, учынілі дзікую расправу над жыхарамі. Старых, жанчын і дзяцей калолі штыкамі, расстрэльвалі, кідалі жывымі у агонь. У гэты дзень карнікі з Астрашыцкага Гарадка і Лагойска спалілі разам з людзьмі вёску Карпілаўку Лагойскага раёна. Гэта быу пачатак карнай аперацы "Котбус". Яна працягвалася да ліпеня

1943 года і была адной з буйнейшых. У ёй прымала ўдзел звыш 80 тысяч салдат і афіцэрау. У барацьбе з партызанамі прымяняліся цяжкая артылерыя, танкі, авіяцыя, знятыя з фронту.

Сведкаи гэтай аперацыі была і Скібіна Елізавета Антонаўна. У ходзе аперацыі "Котбус" была спалена яе хата і хата Харэвіч Соф'і Андрэеўны, дамы размяшчаліся на хутары Здарэнне. Сем'і павінны былі перабрацца у вёску Жукаўка.

У ходзе карнай аперацыі былі знішчаны і нашы вёскі: Каланіцы, Булашы, Саламарэчча. 237 мірных жыхароў былі расстраляны 1 мая 1943 года. Так з'явіўся помнік каля вёскі Саламарэчча. А Елізавета Антонаўна пра той дзень успамінае так: "Я бачыла, як карнікі набліжаліся да вёскі Каланіца, таму вырашыла папярэдзіць мясцовае насельніцтва. З усіх ног кінулася напрамкі, праз лес, вядомай толькі нам — партызанам сцежкай. Папярэдзіць паспела толькі жыхароў крайніх хат. Як стралялі, чула, як палілі і забівалі, не бачыла. Толькі дым, дым ад спаленых хат стаяў доўга над лесам. І крыкі, плач, стогны. Здаецца, і зараз чую іх."

Орден «Отечественной войны» II степени




Медаль «За взятие Берлина»




Медаль «За победу над Германией»




